

Праект Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, часопіса «Маладосць»

Яўген Скібскі

Памяці закатаваных
у «Ноч расстраляных паэтаў»

Ад імя і без даручэння
Дробным катам былых часоў
Гэта змрочнае прысвячэнне,
Гэты выбух ажыўшых слоў.

Хто забіты, хто — напалову,
Губіць час невядома дзе…
Мы ж не лезлі вам у галовы
І не кралі вашых ідэй,

Мы ж не лезлі вам у кішэні,
Не бурылі вашых муроў.
Дык чаму мы для вас — мішэні?
Дык чаму мы накшталт звяроў?

Мы ж не лезлі ў вашы душы,
Каб сумленней стаць і цвярдзей,
Вашы душы — гнілыя грушы:
Дакранешся — будзе смярдзець.

Вы глядзіце вачыма шкля́нымі,
Нібы дохлае жабяня,
Але ж МЫ ляжым пастраляныя —
Цішыня…

Ветры нам паніхіду выюць,
Але ўсё, што вам трэба ведаць:
Нашы душы заўжды жывыя —
Ні драпіначкі, ані следу.

Факсіміле з праекта
«Сталінскія расстрэльныя спісы»
Міжнароднага гісторыка-асветніцкага
таварыства «Мемарыял».